УДК 1(476)+2

Поступила в редакцию 27.04.2017
Received 27.04.2017

**В. Б. Евароўскі**

Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

# НАВУКОВАЯ ШКОЛА Ў ГАЛІНЕ ГІСТОРЫІ ФІЛАСОФСКАЙ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

*Філасофская думка на беларускіх землях развіваецца на працягу дастаткова вялікай колькасці гістарычнага часу. Пачынаючы з сярэдзіны XX ст. праца па абагульненні рэфлексіі і каментаванні асобных фрагментаў нацыянальнай філасофскай спадчыны дасягнула «крытычнай масы», што неўзабаве прывяло да станаўлення і сталення цэлай навуковай школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў. Адначасова з гэтым фарміраваўся тэарэтычны кірунак развіцця навуковай школы са сваімі арыгінальнымі ідэямі і канцэптуальнымі схемамі. Сярод асоб, якія ў свой час вызначалі напрамкі развіцця гісторыка-філасофскіх даследаванняў, трэба адзначыць К. П. Буслова, А. С. Майхровіча, У. М. Конана і інш. На сённяшні момант справядліва размаўляць аб станаўленні паўнавартаснай навуковай школы гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Яе адметнай рысай з'яўляецца наяўнасць унікальнай філасофскай традыцыі, плюралізму думкі і метадаў мыслення, у нейкім сэнсе крытыцызм і міждысцыплінарнасць. Гэта забяспечвае добрую дынаміку вынаходніцтва новых ведаў, не разбураючы пры гэтым фундаментальныя і якасныя часткі ўласнай філасофскай традыцыі. Такім чынам, айчынная філасофія, дзякуючы таксама і намаганням прадстаўнікоў нашай навуковай школы, безумоўна, стала раўнапраўнай часткай сусветнай філасофскай спадчыны.*

**Ключавыя словы:** *беларуская філасофія, гісторыя філасофіі, навуковая школа, філасофская традыцыя, плюралізм, Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, анталагічная гісторыя беларускай філасофскай думкі, пакаленне Школы*

**В. Б. Еворовский**

Институт философии Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

# НАУЧНАЯ ШКОЛА В ОБЛАСТИ ИСТОРИИ ФИЛОСОФСКОЙ И ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ МЫСЛИ БЕЛАРУСИ

*Философская мысль на белорусской земле развивается на протяжении достаточно длительного исторического периода. Начиная с середины XX в. работа по обобщению рефлексии и комментированию отдельных фрагментов национального философского наследия достигла «критической массы», что вскоре привело к становлению и взрослению целой научной школы историко-философских исследований. Одновременно с этим формировалось теоретическое направление развития научной школы со своими оригинальными идеями и концептуальными схемами. Среди лиц, которые в свое время определяли направления развития историко-философских исследований, следует отметить К. П. Буслова, А. С. Майхровича, В. М. Конона и др. Сегодня следует говорить о становлении полноценной научной школы истории философ-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ской и общественно-политической мысли Беларуси, отличительной чертой которой является наличие уникальной философской традиции, плюрализма мысли и методов мышления, в каком-то смысле критицизм и междисциплинарность. Это обеспечивает хорошую динамику появления новых знаний, не разрушая при этом фундаментальных и качественных частей собственной философской традиции. Таким образом, отечественная философия, благодаря также усилиям представителей нашей научной школы, безусловно, стала равноправной частью мирового философского наследия.*

***Ключевые слова:*** *белорусский философия, история философии, научная школа, философская традиция, плюрализм, Институт философии Национальной академии наук Беларуси, онтологическая история белорусской философской мысли, поколение Школы*

**V. Yevarouski**

Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

## SCIENTIFIC SCHOOL IN THE SPHERE OF THE HISTORY OF PHILOSOPHICAL, SOCIAL AND POLITICAL THOUGHT OF BELARUS

*Philosophical thought on the Belarusian land is developed for quite a large amount of historical time. Since the middle of the twentieth century, the work of reflection generalization and commenting individual fragments of the national philosophical heritage has reached a "critical mass", which soon led to the formation and maturation of the whole scientific school of historical and philosophical studies. At the same time, a theoretical direction of development of scientific school with their original ideas and conceptual schemes was rapidly developing. Among those, who determined the directions of development of historical and philosophical studies, there should be noted K. P. Buslov, A. S. Mayhrovich, U. M. Conan and others, which is described in the article. Today one can talk about formation of a full-fledged scientific school of "the history of philosophical and political thought of Belarus", the distinguishing feature of which is the presence of a unique philosophical tradition, pluralism of thought and ways of thinking, criticism and interdisciplinarity. This provides a good dynamics of the invention of new knowledge, not rejecting the fundamental and qualitative part of their own philosophical tradition. Thus the domestic philosophy, thanks also to the efforts of members of our scientific school, definitely became an equal part of the world philosophical heritage.*

***Keywords:*** *Belarusian philosophy, history of philosophy, scientific school, philosophical tradition, pluralism, Institute of Philosophy of the National Academy of Science of Belarus, the Belarusian ontological history of philosophical thought, the generation of School*

## Этап станаўлення (60–80-я гады XX стагоддзя)

Мэтанакіраваныя даследаванні ў галіне беларускай філасофіі праводзяцца ў Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўжо больш за паўстагоддзя. Такім чынам, наша навуковая школа мае сваю гісторыю, пэўныя дасягненні і традыцыю. Таму пры аналізе гісторыі філасофіі Беларусі мы можам зыходзіць з двух магчымых кірункаў. З аднаго боку, прадмет даследавання ўяўляе сабой навуку або шматразова апісаны працэс атрымання новых ведаў.

З другога боку, гісторыя беларускай філасофіі – прадукт творчасці навуковых калектываў якія мэтанакіравана і прафесійна займаюцца пэўнага роду дзейнасцю: даследуюць мінулае нацыянальнай думкі, апісваюць і рэпрэзентуюць яго.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Перыяд сталасці школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў у Беларусі прыпадае на канец 60-х – пачатак 70-х гадоў XX ст. Пасля выхаду кнігі «Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: избранные произведения XVI – начала XIX в.» [1] надышоў час, калі да збору матэрыялу і абагульнення асобных фрагментаў інтэлектуальнай рэальнасці мінулага дадалося напісанне тэарэтычных прац, прысвечаных не толькі пэўнаму абагульненню сабранага матерыялу, але і задумванню той ці іншай канцэптуальнай схемы, здольнай ахапіць усю рэальнасць і паказаць некаторыя тэндэнцыі яе развіцця. Нейкім прамежкавым пунктам гэтай працы было выданне ў 1973 г. пад рэдакцыяй К. П. Буслова «Очерков истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.)» [2]. Па сутнасці, з гэтых дзвюх кніг і пачынае назапашвацца вопыт комплексных даследаванняў у галіне беларускай філасофіі. Праз абагульненне здабыткаў пасляваеннага перыяду адбываецца выбудоўванне тых метадалагічных узораў, на якіх і цяпер грунтуюцца нашыя даследаванні ў галіне гісторыі філасофіі Беларусі.

Збіраць матэрыял, апісваць асобныя персаналіі ці эпохі магчыма, не толькі прытрымліваючыся розных метадалогій, але і кіруючыся рознымі сістэмамі пераконвання або ідэалагічнымі прынцыпамі. Нельга інтэнсіфікацыю развіцця гэтага навуковага кірунку гэтак жа цалкам звесці да нейкіх унутраных механізмаў назапашвання і развіцця ведаў у гэтай галіне гісторыка-філасофскіх даследаванняў. Больш за тое, няправільна разглядаць развіццё гісторыка-філасофскіх даследаванняў у Беларусі па-за кантэкстам агульнага культурнага фону Савецкага Саюза 1960–1970-х гадоў. Перш за ўсё неабходна адзначыць, што працы па гісторыі нацыянальнай філасофіі прыкладна ў гэты ж час з'яўляюцца і ва Украіне [5, 6], і ў Літве [7].

Па сутнасці, для многіх нацыянальных філасофій гэтай прасторы агульнасаюзная гісторыя адначасова была цэласнай версіяй і ўласна лакальнага развіцця, ад якой ужо, зыходзячы з інстытуцыянальных традыцый савецкай філасофіі, вымушаны былі адштурхоўвацца і ўсе далейшыя нацыянальныя тэорыі. Гісторыя філасофскай думкі Беларусі не была тут выключэннем.

Тэндэнцыі развіцця марксісцка-ленінскай філасофіі ў СССР адначасова адкрывалі шырокі шлях да паглыбленага і прафесійнага аналізу ўсёй шматграннай філасофскай спадчыны дамарксісцкага перыяду найперш праз няяўна дэкларуемы зварот да Г. Гегеля, і ў прыватнасці да яго схемы гісторыка-філасофскага працэсу [8]. У Беларусі такая пазіцыя стымулявала іншы важны пласт даследаванняў, які мы цяпер называем станаўленнем прафесійнай філасофіі ў Беларусі [9, 10]. І гэта перадусім «адкрыццё» эпохі Асветніцтва ў Беларусі [11, с. 479–485], якое належыць Э. К. Дарашэвічу і А. А. Біралу. Крыху пазней тэма беларускага Асветніцтва была развіта Э. К. Дарашэвічам ў шэрагу фундаментальных прац [12–14], а таксама стала тэмай яго доктарскай дысертацыі [15].

Другі – фундаментальны блок, на які традыцыйна абапіраецца айчынная школа гісторыка-філасофскіх даследаванняў. Мы маем на ўвазе тэмы, распра-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цаваныя Д. І. Шыраканавым і М. С. Купчыным у рамках праекта «История философии в СССР», звязаныя з агульнапалітычнымі поглядамі беларускіх рэвалюцыйных дэмакратаў (Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, К. Каліноўскі). У чацвёртым томе гэтага выдання даследчыкамі была зроблена спроба ўвядзення ў зварот філасофскага разгляду творчай спадчыны Якуба Коласа і Янкі Купалы [16, с. 652]. У 1970-я гады вышэйадзначаны беларускі рэвалюцыйны дэмакратызм разглядаўся ў крыху абстрактным і ўрэзаным выглядзе – як частка агульнай барацьбы супраць самадзяржаўя, што адбывалася на тэрыторыі Расійскай імперыі. Пазней, дзякуючы найперш даследаванням А. С. Майхровіча [17–19], творчасць і сацыяльная дзейнасць беларускіх рэвалюцыйных дэмакратаў была арганічна звязана з агульным працэсам нацыянальнага развіцця нашай нацыі (гл. пра гэта [20, с. 63–81; 21]).

Ацэньваючы гэты першапачатковы этап, можна адзначыць, што яго дасягненні, прычым не толькі канцэптуальна-метадалагічнага, але і арганізацыйнага плана, былі надзвычай прадуктыўнымі для далейшага развіцця школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў у Беларусі. Гэтая наша выснова пацвярджаецца ўжо тым, што ў наступныя два дзесяцігоддзі выходзіць шэраг фундаментальных манаграфій [22–24], а па выніках даследаванняў калектыў гісторыкаў філасофіі (А. С. Майхровіч, С. А. Падокшын, У. М. Конан і інш.) у 1984 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР за цыкл прац па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі Беларусі дакастрычніцкага перыяду. Такія высокія дасягненні абумоўлены тым, што ўжо на гэтым, першапачатковым этапе развіцця школы ў межах калектыву даследчыкаў беларускай філасофіі была створана творчая атмасфера, вольная ад дагматызму і ідэалагічнай абмежаванасці. Па ўспамінах супрацоўнікаў, з тых далёкіх часоў склалася традыцыя грунтоўнай і нязмушанай дыскусіі пры абмеркаванні, свабоднай ад аўтарытарызму і навязвання пунктаў гледжання, што спрыяла развіццю творчага патэнцыялу ў прадстаўнікоў беларускай філасофскай школы.

Пры разглядзе генезісу школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў Беларусі мы робім акцэнт на інстытуцыйным аспекце, гэта значыць звяртаем увагу не на ўсю традыцыю даследаванняў, але менавіта на той кірунак, які звязаны з дзейнасцю школы ў Акадэміі навук. Вядома, любое падобнае вылучэнне заўсёды будзе ўмоўным, паколькі тое «інтэлектуальнае цела», у якім развіваліся даследаванні па гісторыі беларускай філасофіі, на ўсіх этапах было значна больш аб'ёмным, чым структура акадэмічнай навукі. У прыватнасці, адначасова альтэрнатывай і карысным дадаткам былі тыя даследаванні па беларускай філасофіі, што праводзіліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Дзейнасць навуковай школы звязана з такімі імёнамі, як І. М. Лушчыцкі [25], А. А. Бірала [26, 27], А. С. Кляўчэня [28, 29], М. І. Іоська [30], А. А. Лягчылін [31], В. Ф. Шалькевіч [32, 33], С. А. Малевіч [34] і інш.

Аднак прынцыповае адрозненне паміж гэтымі дзвюма інстытуцыямі, што заўсёды канкурыравалі між сабой, усё ж было. І звязана яно са статусам ціка-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вай для нас галіны нацыянальнай філасофскай думкі. Калі для ўніверсітэта «беларускі напрамак» аж да таго часу, калі наша краіна набыла незалежнасць, заставаўся справай другаснай, то для Інстытута філасофіі менавіта гісторыя філасофскай грамадска-палітычнай думкі Беларусі была «галоўнай гісторыяй філасофіі», па якой у асноўным пісаліся манаграфіі і абараняліся дысертацыі [15, 35]. З іншага боку, у тых даследаваннях, што праводзілі акадэмічныя вучоныя, як правіла, удзельнічалі і выкладчыкі ўніверсітэта. Не сталі выключэннем «Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.)» [2], надрукаваныя ў 1973 г.

Для аднаўлення ўласна гісторыі школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў Беларусі дадзенае выданне ўжо на ўзроўні першага знаёмства з ім дорыць нам некалькі цікавых момантаў. Гэта першая абагульняючыя праца, якая прэтэндуе ўжо на даследчае (а не хрэстаматыйнае) апісанне ўсёй цэласнай гісторыі айчыннай думкі. Да таго ж менавіта ў гэтай кнізе ўпершыню адлюстраваны вынікі даследаванняў А. С. Майхровіча У. М. Конана, Э. К. Дарашэвіча, К. С. Пракошынай, С. А. Падокшына, Н. М. Махнач. Напрыканцы зробім яшчэ адно назіранне. Падобна да фігур на шахматнай дошцы, вучоныя занялі ў дысцыплінарнай структуры нацыянальнай гісторыка-філасофскай навукі строга вызначанае месца. Замацаваўшы за сабой пэўныя дзялянкі, яны адначасова задалі і тыя асноўныя кірункі даследаванняў, у якіх потым развівалася айчынная школа.

Раздзел кнігі, прысвечаны ранняму перыяду беларускай думкі, быў напісаны У. М. Кононам, а асобныя параграфы, звязаныя з эпохай Адраджэння, – С. А. Падокшыным. Рэлігійная праблематыка стала сферай інтарэсаў К. С. Пракошынай, а Асветы – Э. К. Дарашэвіча. У гэтай жа манаграфіі ўпершыню адлюстраваны вынікі праведзеных А. С. Майхровічам даследаванняў рэвалюцыйнага дэмакратызму, а таксама творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Закранаючы ўжо канцэптуальныя моманты аналізуемых «Очерков…» [2], можна адзначыць і тое, што тыя першыя тэксты «патрыярхаў беларускай філасофскай думкі», якія там змешчаны, адначасова з'явіліся таксама пачаткам асэнсавання «космасу нацыянальнай філасофіі». Даследчыкі ўводзілі ў навуковы абарот шэраг важных метадалагічных канцэптаў, якія пазней будуць развіты да ўзроўню шырокіх абагульненняў і змястоўных эксплікацый. Гэта, у прыватнасці, тычыцца намаляваных А. С. Майхровічам вобразаў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта тут мы ўпершыню знаходзім думкі Альфрэда Сцяпанавіча пра ўтапічны характар ідэй Дуніна-Марцінкевіча, а таксама адносна гіпербалізацыі гэтым беларускім пісьменнікам абстрактна-гуманістычных паняццяў. Гэта падмацоўваецца ўпэўненасцю, што, нягледзячы на сваю абмежаванасць, гэта дзейнасць з'явілася «*глебай для ўсведамлення неабходнасці існавання літаратуры на беларускай мове... вытокам рэальных крокаў у гэтым кірунку*» [2, с. 302–303].

Прыкладна ў той жа час у гісторыі школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў Беларусі вызначылася іншая важная тэндэнцыя. Першасная метадало-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гія, на аснове якой ствараліся першыя абагульняючыя работы [1, 2, 25], была выпрацавана з апорай на агульнасаюзную праграму даследаванняў шматнацыянальнай савецкай філасофіі. У 1970-я гады практычна адначасова прапаноўваліся ўжо дзве «ўнутраныя» парадыгмы тэарэтычнага асэнсавання беларускай нацыянальнай філасофіі, якія, па-першае, абапіраліся на тое, што мы ўмоўна можам назваць беларускім духоўным вопытам, а па-другое, з'яўляліся ў цэлым самастойнымі канцэпцыямі. Мы маем на ўвазе манаграфію «Об эстетическом освоении действительности» А. С. Майхровіча [36] і працу У. М. Конана і Э. К. Дарашэвіча «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» [12].

Зусім невялікая па аб'ёме (181 старонка) работа заўсёды была прадметам асаблівага гонару Альфрэда Сцяпанавіча. У гэтай манаграфіі даследчык зрабіў надзвычай рэдкую для савецкай гуманітарнай навукі спробу асабліва дадатнага філасофствавання, у аснову якога была пакладзена прэтэнзія на самастойнае выбудоўванне гісторыка-філасофскага працэсу. У гэтым дачыненні ў агульным корпусе філасофскай спадчыны Беларусі яна займае асаблівае месца. Па сутнасці, манаграфія А. С. Майхровіча – гэта другая пасля «Адвечным шляхам» [37] спроба цэласнага тэарэтычнага асэнсавання гістарычнага працэсу (на гэты раз універсальнага) з пункту гледжання беларускага нацыянальнага досведу. Тут мы бачым не запазычванне гатовых рэцэптаў з існуючага арсенала марксісцка-ленінскай філасофіі, але амаль незалежны рух па асноўных вехах універсальнага інтэлектуальнага развіцця.

У цэлым аналізуемая канцэпцыя ўяўляе складаны і шматгранны сінтэз, прынамсі, трох кампанентаў. Па-першае, пры аналізе эстэтычнага развіцця А. С. Майхровіч актыўна выкарыстоўвае работы А. Ф. Лосева і яго досвед аналізу дынамікі антычнай эстэтычнай думкі. Па-другое, у манаграфіі «Об эстетическом освоении действительности» гэты беларускі філосаф упершыню апрабоўвае гегелеўскія схемы рэпрэзентацыі гісторыка-філасофскага працэсу як дынамічнай мадэлі. І па-трэцяе, замест традыцыйнага для марксізму-ленінізму прызнання класавай барацьбы і прымата эканомікі як галоўных рухаючых сіл гісторыі Альфрэд Сцяпанавіч нібы вяртаецца да ранняга К. Маркса, гаворачы пра веліч працы наогул у трох яе іпастасях: пераўтварэння грамадства, узбагачэння чалавека і ўскладнення пазнавальнай дзейнасці.

Навуковая спадчына А. С. Майхровіча шматгранная і ахоплівае амаль увесь спектр пытанняў, над якімі і цяпер працягвае працаваць айчынная гісторыя філасофіі. Гэта працы ў галіне гісторыі культуры, сацыяльнай філасофіі, эстэтыкі, этыкі. Ён імкнуўся не толькі выкладаць гісторыю беларускай думкі, але і канцэптуальна выбудоўваць яе асноўныя вехі, звязваючы тэксты, персаналіі, а таксама інтэрпрэтацыі перыядаў у адзіную лінію, падпарадкаваную агульнай ідэі збудавання. У якасці стрыжня, што спалучаў усе эпохі і народы ў агульную гісторыю, А. С. Майхровіч прызнаваў ідэі гуманізму, а эвалюцыю грамадства вучоны разглядаў менавіта як яго гуманізацыю.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З гэтага пункту гледжання ў першай главе манаграфіі А. С. Майхровіч разглядае эвалюцыю чалавечай цывілізацыі, якую падзяляе на фазы, што азначаюць узровень гуманізацыі. У якасці першаснай фазы існавання чалавецтва ён разглядае «нарматыўна-забаронную табуіраванасць» першабытнага грамадства. Маральнасць, якая мае свой пачатак у Антычнасці, дасягае сваёй завершанасці ў светапоглядзе, што склаўся на аснове хрысціянскіх прынцыпаў, а менавіта ў той антрапалагічнай мадэлі, перадумовай якой з'яўляецца хрысціянскае веравызнанне.

Сваімі працамі А. С. Майхровіч стварыў трывалы метадалагічны каркас для ажыццяўлення цяперашніх даследаванняў, а таксама выканання вялікай і ўсеабдымнай праграмы па напісанні шматтомнай гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Творчая спадчына А. С. Майхровіча з'яўляецца базісам паспяховага развіцця айчыннай школы гісторыі філасофіі, што вывучае духоўную спадчыну нашага народа.

Уладзімір Конан – таксама знакавая постаць школы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Хаця для тых, хто знаёмы з творчасцю гэтага філосафа, відавочна, што сутнасць яго спадчыны не можа быць зведзена толькі да нейкай пэўнай галіны філасофіі і да галіны гуманітарыстыкі наогул. Ён уяўляў сабой рэдкі для сучаснасці тып вучонага-энцыклапедыста. У беларускай культуры Уладзімір Міхайлавіч лічыўся прызнаным аўтарытэтам шмат у якіх галінах ведаў: ад фалькларыстыкі і культуралогіі да беларускай філалогіі і мастацтвазнаўства. І ўсё ж дазволім сабе меркаванне, што, звяртаючыся да ўсіх шматлікіх прадметаў свайго зацікаўлення, ён выступаў найперш як філосаф – гэта значыць імкнуўся шляхам напрацоўкі і наступнай інтэрпрэтацыі выкарыстоўваць велізарны факталагічны матэрыял перш за ўсё для верыфікацыі пэўнай канцэпцыі беларускага нацыянальнага генезу. Пры гэтым, вядома, нельга меркаваць, што ён быў пад ціскам нейкай канцэпцыі, пад якую «падганяў» матэрыял, хутчэй мы можам выказаць здагадку пра тое, што гэты філосаф практыкаваў нейкую *ўніверсальную метадалогію*, якая, як і ў любых іншых выпадках, абапіралася, з аднаго боку, на структуру перакананняў, а з іншага – на выбар канона з універсальнай школы думкі.

Аднак пры аналізе асаблівасці дыялектыкі У. М. Конана неабходна вылучыць яшчэ адзін істотны момант, які мае дачыненне ўжо не да філасофска-тэарэтычных, а да агульнасветапоглядных асноў яго творчасці. Гаворачы пра мэты і задачы сваёй кнігі «Ля вытокаў самапазнання…», ён бярэ за аснову менавіта ўзнаўленне народнай культуры [38, с. 3], гэта значыць, ператварэнне гэтай спадчыны ў нацыянальную рэальнасць ва ўсёй цэласнасці. Мы тут, па сутнасці, бачым філасофскае пераасэнсаванне той жа, ужо адзначанай намі ў пачатку артыкула рэвалюцыйна-дэмакратычнай мадэлі. Кніга «Ля вытокаў самапазнання…», што выйшла ў свет напярэдадні набыцця суверэнітэту Беларуссю, сваёй назвай наглядна паказала той кірунак пошуку вытокаў, які, магчыма, у крыху метафарычнай і завуаляванай форме вызначае народныя ка-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рані новага беларускага Адраджэння. Да гэтай жа канвы дыялектыкі архаічнага і сучаснага, як падкрэслівае С. І. Санько [39, с. 27], У. М. Конан звяртаецца і ў сваёй апошняй рабоце – першым томе «Гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» [40].

Калі даследаванні А. С. Майхровіча ў галіне гісторыі філасофіі пачыналіся з параўнальна невялікай па аб'ёме манаграфіі [36], то для У. М. Конана такімі ўводзінамі стала напісаная разам з Э. К. Дарашэвічам кніга «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» [12]. Перш чым звярнуцца непасрэдна да гэтай працы, адзначым дзіўнае падабенства двух загалоўкаў. І Майхровіч і Конан пачыналі менавіта з эстэтыкі. Гэта, у прынцыпе, у адносінах да агульнай гісторыі беларускай любамудрасці з'яўляецца заканамерным, паколькі відавочна, што асноўнай субстанцыяй існавання крайніх бачанняў свету была менавіта мастацкая культура.

З іншага боку, «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» не зводзіцца да класічнай эстэтычнай парадыгмы, але выходзіць на выключна філасофскія абагульненні, разглядаючы генезіс айчыннай культуры менавіта як гісторыю думкі. Па сутнасці, у гэтай працы мы маем (бадай, упершыню) спробу такой канцэптуалізацыі, якая выходзіць за тыя дэскрыптыўныя межы, што можна вызначыць як «*філасофская думка ў Беларусі*», і, наадварот, патрабуе менавіта *гісторыі філасофіі Беларусі* як нейкай канцэптуальна аформленай і метадалагічна структураванай субстанцыі, імпліцытна прывязанай да нашага «нацыянальнага космасу».

Дадзеная манаграфія Конана і Дарашэвіча, хаця не ў прама дэкларыванай форме, але ўсё ж відавочна ставіла задачу рэканструкцыі беларускай культуры менавіта як адзінага духоўнага цела, што мела ўнутры нейкую іманентную логіку развіцця.

Гаворачы пра тое, як працавала схема полілінгвістычнай мадэлі беларускай філасофіі, адзначым, што яна стварыла вельмі камфортныя ўмовы для шматграннай работы па назапашванні матэрыялу, яго перакладу і філасофскай інтэрпрэтацыі. У гісторыю аддзела гісторыі філасофіі ўвайшлі вельмі цёплыя ўспаміны пра рэгулярныя камандзіроўкі супрацоўнікаў у Вільнюс, Маскву і Ленінград, дзе з надзвычайнай скрупулёзнасцю выбіраліся і капіраваліся разнастайныя крыніцы, у тым ліку на лацінскай і польскай мовах. Вынікі гэтай працы сталі асновай для напісання манаграфій і навуковых артыкулаў У. В. Дуброўскага [41], А. Я. Цукермана [42], Л. А. Чарнышовай [43]. Крыху пазней, ужо ў пачатку 1990-х гадоў, выйшла ў свет своеасаблівая анталогія «Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в.» [44], у якой змешчалася большая частка перакладзеных і інтэрпрэтаваных крыніц. На гэтай жа факталагічнай базе дзякуючы арганізацыйным намаганням і тэарэтычным напрацоўкам К. С. Пракошынай [45, 46] была створана школа беларускага рэлігіязнаўства.

Назапашаны матэрыял стаў факталагічнай базай для вялікай колькасці даследаванняў, прысвечаных як асобным персаналіям, так і цэлым эпохам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мы ўжо адзначалі кардынальнае значэнне ключавых для разумення айчыннай філасофскай думкі рэканструкцый такіх стадый яе развіцця, як Асветніцтва, якое даследаваў Э. К. Дарашэвіч [12, 13, 15], а таксама Адраджэнне – любімая тэма намаганняў С. А. Падокшына [47]. Беларускі рамантызм і позняе Асветніцтва даследавала Н. М. Махнач [48–50]. А. С. Майхровіч на працягу ўсёй сваёй творчасці цаглінка за цаглінкай будаваў цэласную і шматгранную карціну дынамікі станаўлення беларускай нацыянальнай ідэі, а таксама канцэптуалізаваў Сярэднявечча і ранні Рэнесанс [17–19, 51]. Нейкай канкурэнтнай мадэллю выступалі канструкцыі У. М. Конана [52, 53].

Працэсы перабудовы і дэмакратызацыі грамадства дазволілі беларускім філосафам зрабіць чарговы крок, які па сваёй значнасці стаў вянцом агульнай тэорыі айчыннай думкі. Менавіта ў сумеснай беларуска-літоўскай манаграфіі «Философская и общественно-политическая мысль Белоруссии и Литвы: дооктябрьский период: закономерности развития, проблемы исследования» [23] упершыню многія рэчы былі названы сваімі імёнамі. Тут у дадатак да абстрактных у пэўнай ступені разваг пра рэвалюцыйна-вызваленчую барацьбу беларускага народа ў выразнай і зразумелай форме быў уведзены канцэпт «нацыянальнай філасофскай думкі» і пастаўлена задача распрацоўкі «агульнай канцэпцыі нацыянальнага гісторыка-філасофскага працэсу» [23, с. 4–5]. Крыху пазней гэтая ўжо відавочна эксплікаваная навуковая праграма становіцца краевугольным каменем апошніх манаграфій А. С. Майхровіча [19, 51]. Тыя інтэнцыі свабоды і эмансіпацыі ад нацыянальнага і класавага ўціску, што ставіліся гэтым філосафам на ўсіх этапах яго творчасці, былі тут пададзены квінтэсенцыяй беларускай нацыянальнай ідэі, светапоглядным падмуркам станаўлення Рэспублікі Беларусь як суверэннай і незалежнай дзяржавы [54, 55].

## Сучасны стан і перспектывы развіцця

Не ва ўсіх нацыянальных навуковых традыцыях ёсць такая дысцыпліна, як уласная гісторыя філасофіі. Самым простым адказам на тое, чаму на Беларусі працягваюць шукаць нефіласофскія формы філасофствавання, з'яўляецца выраз накшталт «я раблю так, бо так рабілі да мяне». На самой справе ёсць традыцыя ці, дакладней кажучы, навуковая школа, існаванне якой падпарадкоўваецца сваім уласным законам. Нейкая навуковая школа мае момант свайго нараджэння, свайго росквіту і, нажаль, разбурэння. Больш таго, навуковая школа разам са сваёй уласнай гісторыяй узнікнення і развіцця, ці геніалогіяй, мае тое, што называецца легендарнай гісторыяй, бо шмат якія даследчыкі захоўваюць сярэднявечную сціпласць. Так, С. А. Падокшын, упершыню распрацоўваючы канцэптуальныя высновы беларускага Рэнесансу, знаходзіў «вытокі» сваёй канцэпцыі ў М. Багдановіча, Ц. Любаўскага. А. С. Майхровіч свае разважанні аб лёсах беларускай цывілізацыі (дарэчы, у духу філасофіі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Г.-В.-Ф. Гегеля) укладваў у вусны Еўфрасінні Полацкай ці невядомых аўтараў старажытных беларускіх летапісаў.

Якія ж здабыткі прынесла беларуская гісторыка-філасофская традыцыя савецкага і постсавецкага перыяду? Яна пачыналася з селекцыі фрагментаў, якія мелі філасофскія канатацыі, а скончылася пошукамі існага быцця і чалавека Альфрэда Майхровіча [19] і архетыпамі культуры Уладзіміра Конана [56]. Цікава тут і другое, гэта па вялікім рахунку другасная філасофская дысцыпліна выхавала інтэлектуальных волатаў нацыянальнага маштабу: У. Конана, А. Майхровіча, С. Падокшына. Нешта падобнае мы можам назіраць у філасофскай традыцыі нашых суседзяў [57]. Імёны Раманаса Плячкайціса [58] у Літве, Вілена Горскага [59, 60] ва Украіне самі па сабе з'яўляюцца сімвалічнымі. Была такая асаблівасць савецкай гуманітарнай навукі, што самае цікавае ў ёй рабілася на маргінэсе. Савецкі час – гэта перыяд панавання завуаліраваных форм. Калі кнігі пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння ляжалі ў спецсховішчах, даследаванні ў галіне, напрыклад, Сярэднявечча і Рэнесансу заставаліся амаль адзінай формай развіцця самасвядомасці беларускай нацыі.

Вядома, мы працягваем традыцыю. Але што ёсць гэта традыцыя? Бо калі мы не маем адказу на гэтае пытанне, немажліва ні яе падсумаванне, ні яе развіццё. У 2008–2013 гг. наша даследчая група падрыхтавала і выпусціла ў свет тры тамы «Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі»… Гэту гісторыю аўтарскі калектыў лічыў менавіта падсумаваннем і развіццём той традыцыі, асновы якой закладваліся ў 1970–1990-я гады. Калі праводзіць пэўныя аналогіі з агульнай гісторыяй філасофіі, то перад намі ў гэтай справе паўсталі выклікі крытычнага перыяду, не ў сэнсе развітання з мінулай спадчынай навуковай школы і нават не ў спробе яе пераасэнсавання, а хутчэй у кантаўскім сэнсе крытычнай філасофіі.

У максімальна абагульненым выглядзе такі падыход, з аднаго боку, мае на ўвазе рэфлексію над самімі асновамі той ці іншай карціны філасофскага працэсу, а з іншага – ужо з улікам гэтай важнай крытычнай работы – новае рэканструяванне таго, што мы ўмоўна назвалі анталагічнай гісторыяй беларускай філасофскай думкі. Акрамя таго, асаблівасцю новага перыяду дзейнасці школы было і тое, што можна адзначыць як плюралізм думкі ва ўмовах, калі розныя даследчыкі прыйшлі ва ўлонне школы не толькі па-свойму трапіўшы ў прафесію, але з уласнымі метадалагічнымі праграмамі, апасродкаванымі тымі канкрэтнымі ўчасткамі работы, якім яны прысвяцілі сваю творчую актыўнасць.

Напрыклад, С. І. Санько асноўную сферу сваіх акадэмічных зацікаўленняў [61, 62] вызначае як кампаратыўную гісторыю светапоглядаў з адмысловым акцэнтам на ўзнаўленні ключавых фрагментаў светапоглядных сістэм грамадстваў, гісторыя якіх слаба (або зусім не) дакументаваная. У прыватнасці, значная ўвага ў гэтых даследаваннях надаецца рэканструкцыі традыцыйнага светапогляду насельніцтва Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Шэраг навацый у структуру нацыянальных гісторыка-філасофскіх даследаванняў уносіць І. М. Бабкоў [9; 10; 20, с. 32–37]. Прычым значэнне яго творчасці ў дынаміцы агульнага канона школы можна ахарактарызаваць з розных бакоў. Найперш, мы бачым тут пэўны сінтэз інтэнцыі дадатнай філасофіі са спробай крытычнага пераасэнсавання прадмета нацыянальнай думкі, які разглядае вучоны. З іншага боку, творчасць гэтага філосафа характарызуецца адданасцю стратэгіям постструктуралізму і посткаланіяльных даследаванняў, якія І. М. Бабкоў паслядоўна праводзіць пры вывучэнні цікавых для яго аб’ектаў беларускай філасофскай спадчыны. У гэтым дачыненні заслугоўвае ўвагі прасоўваемая ім арыгінальная мадэль айчыннага Асветніцтва, канцэптуалізацыя плыняў рамантызму ў Беларусі з першай у гісторыі школы спробай уключэння гэтай інтэлектуальнай структуры ў агульны працэс нацыянальнага будаўніцтва.

У манаграфіі «Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.)» [63] і іншых публікацыях [64, 65] В. У. Старасценкі на аснове помнікаў грамадска-філасофскай думкі ажыццёўлена сістэмная рэканструкцыя перадумоў і фактараў фарміравання, станаўлення і развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў канца XVI – першай паловы XVII ст. у кантэксце асаблівасцей нацыянальна-культурнага і рэлігійнага жыцця Беларусі ў гэты перыяд.

Аляксей Дзермант працуе ў галіне гісторыі ідэй і сацыяльнай філасофіі. Займаецца вывучэннем генезісу правасвядомасці ў еўрапейскай традыцыі, ролі традыцыйнага маральна-прававога складніку ў фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці. У працэсе падрыхтоўкі шасцітомнага выдання «Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі» вучоны правёў даследаванне рэцэпцыі рымскай рэспубліканскай і імперскай ідэй у Вялікімі Княстве Літоўскім. Даследуе асабівасці фарміравання філасофіі еўрапейскага традыцыяналізму і яе ўплыў на погляды дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння. Плённы сінтэз падыходаў сучаснага рэлігіязнаўства пры рэканструкцыі шырокіх пластоў беларускай духоўнай гісторыі дэманструе Н. А. Кутузава [66]. Стратэгіі лінгвістычнага аналізу прынеслі пэўныя вынікі І. М. Новіку [67] пры даследаванні станаўлення беларускай савецкай філасофіі 20–30-х гадоў XX ст.

У нашай сённяшняй практыцы гісторыка-філасофскіх даследаванняў сучаснае пакаленне школы (узнаўляючы найлепшыя ўзоры айчыннай гісторыка-філасофскай школы, даючы чытачу судакрануцца з думкай мэтраў і патрыярхаў гэтай дысцыпліны ў Беларусі) адначасова ўводзіць шмат якіх «навінаў» – гэта і метадалагічны апарат, рэлевантны дасягненням сучаснай гуманітарыстыкі, і новыя крыніцы, не даследаваныя і не задзейнічаныя ў папярэднія часы. Напрыклад, пры ўжыванні плюралізму да канцэптаў і персаналіяў беларускага Адраджэння пры напісанні другога тома гісторыі філасофіі мы атрымалі такія парадаксальныя пары практычна раўназначнага ўжы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вання, як матэрыялізм і эгацэнтрызм, атэізм і ірацыянальнае перажыванне найвышэйшага, рацыяналізм і *melancholia generosa*, дэмакратызм і элітарнасць, асветніцтва і «рынак сімвалічнай прадукцыі».

Гісторыя філасофіі нацыі заўсёды з'яўляецца калектыўнай працай, якая аб'ядноўвае ў сабе галасы і сучасных навукоўцаў, і навукоўцаў, якія ўжо пайшлі з жыцця. У гэтых умовах дасягненне цэласнасці і сістэматычнасці канчатковага прадукту патрабуе сапраўды ўсеабдымнай працы. З аднаго боку, для нас заўсёды важныя першапачатковыя сэнсы, закладзеныя ў тым або іншым філасофскім тэксце, які ўключаецца ў корпус нацыянальнай гісторыі філасофіі. З іншага боку, неабходна надзвычайная павага да працы таго або іншага аўтара, думкі якога выкарыстоўваюцца пры стварэнні такой гісторыі. І, нарэшце, трэцяе – аб'ядноўваючы розныя часавыя зрэзы ў адзінае цэлае, мы бяром на сябе вельмі няўдзячную задачу: злучыць заўсёды неадназначную сучаснасць з яшчэ больш загадкавым мінулым.

Не «рухаючы старыну» – гэта і новае інстытуцыянальнае разуменне нашай «гісторыка-філасофскай працы» не толькі з традыцыйнага пункта гледжання (суадносіны навуковец – грамадства, навуковец – дзяржава), але і ў значэнні сацыяльнай адказнасці перад сваёй навуковай карпарацыяй, гэта значыць, перад сваёй галоўнай і апошняй інстанцыяй, якая не проста ацэньвае, але і прадуцыруе першапачатковую легітымацыю ўсіх канцэптуальных пабудоў і факталагічных прадуктаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избр. произведения XVI – нач. XIX в. / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии ; [под общ. ред. В. А. Сербенты]. – Минск : Изд-во АН БССР, 1962. – 524 с.

2. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.) / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии и права; [редкол.: К. П. Буслов (гл. ред.) и др.]. – Минск : Наука и техника, 1973. – 556, [1] с.

3. Ленин, В. И. К характеристике экономического романтизма / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Политиздат, 1967. – Т. 2. – С. 125–261.

4. Ленин, В. И. И. Ф. Арманд. 30 ноября 1916 г. / В. И. Ленин. // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Политиздат, 1970. – Т. 49. – С. 329–330.

5. Від Вишенського до Сковороди (з історії філософської думки на Україні XVI–XVII ст.) / ред. В. М. Нічік. – Київ : Наук. думка, 1972. – 142 с.

6. Нарис історії філософії на Україні / ред. колегія: Д. Острянин (гол.) [та ін.]. – Київ : Наук. думка, 1966. – 656 с.

7. Plečkaitis, R. Feodalizmo laikotarpio filosofija Lietuvoje: filosofija Lietuvos mokyklose XVI–XVIII amžiais / R. Plečkaitis. – Vilnius : Mintis, 1975. – 529 p., 528 leaves of plates.

8. Hegel, G. W. F. Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie : in 4 T. (Bd 6–9) / G. W. F. Hegel ; Hrsg. P. Garniron, W. Jaeschke. – Hamburg : F. Mainer Verlag, 1986. – Bd 6. – 876 S.

9. Бабкоў, І. Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў / Ігар Бабкоў. – Менск : Логвінаў, 2005. – 140, [1] с. – (Галерэя Б).

10. Бабкоў, І. Філасофія Яна Снядэцкага / Ігар Бабкоў. – Мінск : Часоп. «Фрагмэнты» : Логвінаў ; Вільнюс, 2002. – 135 с. – (Гісторыя думкі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

11. История философии в СССР : в 5 т. / АН СССР, Ин-т философии МГУ им. М. В. Ломоносова, Филос. фак. ; редкол.: В. Е. Евграфов [и др.]. – М. : Наука, 1968. – Т. 2. – 601 с.

12. Дорошевич, Э. К. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э. К. Дорошевич, В. М. Конон. – М. : Искусство, 1972. – 319 с.

13. Дорошевич, Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии / Э. К. Дорошевич. – Минск : Наука и техника, 1971. – 246 с.

14. Дорошевич, Э. К. Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения / Э. К. Дорошевич. – Минск : Наука и техника, 1967. – 253 с.

15. Дорошевич, Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии : дис. … д-ра филос. наук : 09.00.03 / Э. К. Дорошевич. – Минск, 1983. – 395 с.

16. История философии в СССР : в 5 т. / АН СССР, Ин-т философии МГУ им. М. В. Ломоносова, Филос. фак. ; редкол.: В. Е. Евграфов [и др.]. – М. : Наука, 1971. – Т. 4. – 836 с.

17. Майхрович, А. С. Янка Купала и Якуб Колас: вопросы мировоззрения / А. С. Майхрович ; ред. В. М. Конон. – Минск : Наука и техника, 1982. – 246 с.

18. Майхрович, А. С. Белорусские революционные демократы: важнейшие аспекты мировоззрения / А. С. Майхрович ; ред. Н. С. Купчин. – Минск : Наука и техника, 1977. – 205, [2] с.

19. Майхрович, А. С. Поиск истинного бытия и человека: из истории философии и культуры Беларуси / А. С. Майхрович ; ред. Д. И. Широканов. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 245, [2] с.

20. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / В. Б. Евароўскі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 1. – 540 с.

21. Yevarouski, V. Searchings after the Cognitive Centre. (The Case Of Belarus) / V. Yevarouski // Limes: Cultural Regionalistics. – 2010. – Vol. 3, N 1. – P. 5–27.

22. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии: дооктябрьский период / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии и права ; ред. К. П. Буслов. – Минск : Наука и техника, 1977. – 279 с.

23. Философская и общественно-политическая мысль Белоруссии и Литвы: дооктябрьский период: закономерности развития, проблемы исследования / под ред. А. С. Майхровича. – Минск : Наука и техника, 1987. – 335, [1] с.

24. Идеи материализма и диалектики в Белоруссии: дооктябрьский период / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии и права ; ред. К. П. Буслов. – Минск : Наука и техника, 1980. – 344 с.

25. Лушчыцкі, І. М. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ў другой палавіне XIX веку / І. М. Лушчыцкі ; М-ва выш. адукацыі СССР, Беларус. дзярж. ун-т імя У. І. Леніна. – Мінск : Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1958. – 367 с.

26. Бирало, А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII в. / А. А. Бирало. – Минск : Изд-во БГУ, 1971. – 179 с.

28. Клевченя, А. С. Очерки по истории марксистско-ленинской философской мысли в Польше / А. С. Клевченя. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 254 с.

29. Клевченя, А. С. Стефан Руднянский (Из истории марксистско-ленинской мысли в Польше) / А. С. Клевченя. – Минск : Наука и техника, 1968. – 254 с.

30. Иосько, М. И. Николай Судзиловский-Руссель: жизнь, революционная деятельность и мировоззрение / М. И. Иосько. – Минск : Изд-во БГУ, 1976. – 335 с.

31. Легчилин, А. А. Рецепции немецкой философии в Беларуси и Литве / А. А. Легчилин, В. Ф. Шалькевич // Историко-философские исследования в регионах Восточной Европы: опыт, задачи, социокультурное значение : материалы междунар. науч. конф., г. Минск, 26 апр. 2013 г. / [редкол.: А. А. Лазаревич (сопредседатель) и др.]. – Минск : Право и экономика, 2013. – С. 68–76.

32. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : Грамад. аб’яд-не «Маладзеж. супольніцтва», 2002. – 247 с.

33. Шалькевіч, В. Ф. Кастусь Каліноўскі: старонкі біяграфіі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : [б. в.], 1985. – 125, [2] с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

34. Малевич, С. А. Вопросы исторического материализма в трудах Людвига Крживицкого: из истории формирования марксистской философии в Польше / С. А. Малевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1971. – 179 с.
35. Майхрович, А. С. Белорусские революционные демократы: формирование и важнейшие аспекты мировоззрения : дис. … д-ра филос. наук : 09.00.03 / А. С. Майхрович. – Минск, 1982. – 399 с.
36. Майхрович, А. С. Об эстетическом освоении действительности / А. С. Майхрович. – Минск : Наука и техника, 1973. – 181 с.
37. Канчэўскі, І. У. [Абдзіраловіч І.] Адвечным шляхам : дасьледзіны беларус. сьветагляду / І. У. Канчэўскі ; прадм. С. Дубаўца. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 43 с. – (Згукі мінуўшчыны).
38. Конан, У. М. Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. М. Конан. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 238 с.
39. Отчет о научно-исследовательской работе «Філасофія ў сістэме нацыянальнай культуры: параўнальны аналіз гісторыка-філасофскіх даследаванняў у Беларусі і Украіне» (заключительный договор с БРФФИ № Г1К-039 от 15 апр. 2011 г. / В. Б. Еворовский [и др.]. – Минск : Ин-т философии Нац. акад. наук Беларуси, 2013. – 91 с.
40. Конан, У. М. Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі : у 3 т. / У. М. Конан. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Т. 1. – 438 с.
41. Дубровский, В. В. Казимир Нарбут / В. В. Дубровский. – Минск : Наука и техника, 1979. – 136 с.
42. Цукерман, А. Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII века / А. Я. Цукерман. – Минск : Наука и техника, 1980. – 111 с.
43. Чернышева, Л. А. Латиноязычная традиция в культуре белорусского барокко / Л. А. Чернышева ; ред. М. П. Стриженок // Белороссика: книговедение, источники, библиография. – Минск : Фундамент. б-ка им. Я. Коласа, 1980. – С. 68–80.
44. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / ред. А. С. Майхрович. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 318, [1] с.
45. Прокошина, Е. С. Казимир Лыщинский / Е. С. Прокошина. – Минск : Беларусь, 1986. – 93 с.
46. Прокошина, Е. С. Очерк свободомыслия и атеизма в Белоруссии в XIX в. / Е. С. Прокошина. – Минск : Наука и техника, 1973. – 226 с.
47. Подокшин, С. А. Философская мысль эпохи Возрождения в Белоруссии: от Скорины до Симеона Полоцкого / С. А. Подокшин. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 283, [2] с.
48. Мохнач, Н. Н. Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1985. – 94 с.
49. Мохнач, Н. Н. От просвещения к революционному демократизму: обществ.-полит. и филос. мысль Белоруссии конца 10-х – начала 50-х годов XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1976. – 184 с.
50. Мохнач, Н. Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30–40-е годы XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1971. – 157 с.
51. Майхрович, А. С. Становление нравственного сознания: из истории духовной культуры Беларуси / А. С. Майхрович. – Минск : Беларус. кнігазбор, 1997. – 204 с.
52. Конон, В. М. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. / В. М. Конон. – Минск : Наука и техника, 1985. – 200 с.
53. Конон, В. М. От Ренессанса к классицизму: становление эстетической мысли Белоруссии в XVI–XVIII вв. / В. М. Конон. – Минск : Наука и техника, 1978. – 158 с.
54. Майхровіч, А. С. Які ён, шлях Беларусі да дэмакратычнай дзяржавы? / А. С. Майхровіч. – Мінск : Права і эканоміка, 1996. – 38 с.
55. Майхрович, А. С. Идеология: сущность, назначение, возможности / А. С. Майхрович. – Минск : Право и экономика, 2001. – 76, [2] с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

56. Конан, У. М. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу / У. М. Конан. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка, Навук.-асветн. цэнтр, 2006. – Т. 1. – 175, [1] с.

57. Yevarouski, V. R. Pleckaitis and Belarusian Tradition of Studies in the National History of Philosophy / V. Yevarouski // Problemos. – 2010. – Supplement. – P. 28–37.

58. Plečkaitis, R. Lietuvos filosofijos istorija / R. Plečkaitis. – Vilnius : Kultūros, filosofijos ir meno institutas, 2004. – 715 p.

59. Горьский, В. С. Святі Київськой Русі / В. С. Горьский. – Київ : Абрис, 1994. – 175 с.

60. Горьский, В. С. Історія українськой філософії / В. С. Горьский. – Київ : Наук. думка, 1996. – 288 с.

61. Санько, С. І. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі / С. І. Санько. – Менск : БГАКЦ, 1998. – 189 с.

62. Дзермант, А. Этнагенез баларусаў: навука і ідэалогія / А. Дзермант, С. Санько // Arche. – 2005. – № 5. – С. 233–253.

63. Старостенко, В. В. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.) / В. В. Старостенко. – Могилев : [Изд-во МГУ им. А. А. Кулешова], 2001. – 197, [1] с.

64. Старостенко, В. В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории / В. В. Старостенко. – Могилев : [Изд-во МГУ им. А. А. Кулешова], 2011. – 271 с.

65. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / В. Б. Евароўскі [і інш.]. ; пад рэд. В. Б. Евароўскага, А. А. Лазарэвіча. – Мінск : Беларус. навука, 2008–2013. – Т. 1–3.

66. Кутузова, Н. А. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII в. / Н. А. Кутузова. – Минск : Право и экономика, 2005. – 98, [1] с.

67. Новик, И. М. С. Я. Вольфсон и белорусская советская философия 20-х гг. XX в / И. М. Новик // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2013. – № 1. – С. 5–9.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова